№ 11 (19)

# ВОЛЬНАЯ Бярозаўка

ГАРАДЗКАЯ НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЭТА

## Эўрафорум адбыўся



14 лістапада ў Менску, ў ДК МАЗа, адбыўся Беларускі Эўрапейскі форум.

Мерапрыемства было задуманае як пляцоўка для абмеркаваньня розных поглядаў на супрацоўніцтва з Эўропай. У форуме ўдзельнічалі больш за 800 дэлегатаў з усіх рэгіёнаў Беларусі і больш за 200 гасьцей, у тым ліку і замежных: з Польшчы, Германіі, Францыі, Латвіі, Расеі. Падчас Форуму абмяркоўваліся розныя шляхі разьвіцьця Беларусі ў палітычным, эканамічным, грамадзкім плане.

Арганізатарамі мерапрыемства выступілі 8 дэмакратычных арганізацыяў Беларусі, старшынём аргкамітэту быў абраны **Аляксандар Мілінкевіч**.

У форуме ўдзельнічалі таксама і дэлегаты ад Бярозаўкі.

## *Крызіс спараджае нянавісьць?*

Паводле вынікаў апытаньня, беларусы падчас крызісу сталі больш злымі, перасталі верыць дзяржаве і спадзяюцца на тое, што “ўсё само сабой вырашыцца”. Дасьледваньне праводзіла аксіямэтрычная лабараторыя “Новак”.

Праявы азлобленасьці асабліва заўважныя там, дзе зьбіраюцца масы людзей, калі, напрыклад, нехта захоча прайсьці без чаргі ці нешта падобнае. Адразу ўзьнікае канфлікт, часам адбываюцца бойкі.

Чамусьці людзі ахвотна “зрываюць злосьць” на бліжэйшых, хаця абсалютная большасьць усьведамляе, што ў складаўшыхся абставінах вінаватая некампетэнтная ўлада. Можа, сорамна прызнацца, нават самім сабе, што вінаватыя самі, калі абралі гэтую ўладу 15 гадоў таму?

## *Нам жыць тут!*

Менавіта пад такім слоганам праводзіцца кампанія за паляпшэньне медычнага абслугоўваньня ў Бярозаўцы. Кампанію праводзіць ініцыятыўная група, у якую ўвайшлі сябры Руху “За Свабоду!”, Партыі БНФ, а таксама людзі, якія не ўваходзяць ні ў якія арганізацыі, але якім неабыякавыя ўмовы жыцьця ў родным горадзе.

***Больш падрабязна – на старонцы 2***



горад

# Бярозаўка – за лепшую медыцыну

Пра тое, што сітуацыя з медычным абслугоўваньнем у Бярозаўцы за апошнія гады значна пагоршылася, ужо не раз пісалася ў нашай газэце, гэта адзначаюць і амаль усе жыхары нашага гораду.

У лістападзе ініцыятыўная група жыхароў Бярозаўкі арганізавала калектыўны зварот да органаў улады з заклікам разгледзець пытаньне аб паляпшэньні сітуацыі з медабслугоўваньнем у горадзе. Як адзначаюць арганізатары звароту, гараджане цалкам станоўча, з разуменьнем паставіліся да ўзнятага пытаньня. Грамадзяне ўсьведамляюць, што калі праблему замоўчваць, то яна не зьнікне, таму такіх, хто адмаўляўся паставіць подпіс пад зваротам, амаль не было. Агулам падпісалася больш як 500 чалавек.

Зварот накіраваны ў Лідзкі райвыканкам, засталося толькі дачакацца афіцыйнага адказу, які, паводле заканадаўства, павінны даць не пазьней, як праз месяц.

***Калі хто жадае далучыцца да ініцыятыўнай групы, альбо калі ёсьць прапановы па паляпшэньню ўмоваў жыцьця ў нашым горадзе – пішыце на электронны адрас horad.nasz@gmail.com.***

**Нам жыць тут!**

***Ініцыятыўная група***

# Прызначаныя прыгажуні

У Бярозаўцы адбыўся конкурс прыгажосьці “Міс Прынямоньне – 2009”.




Такімі мерапрыемствамі сёньня нікога ня зьдзівіш, не праводзяцца хіба што “Міс вёска”, бо ў вёсках амаль няма маладых дзяўчат. Цяжка таксама сказаць, чым адрозьніваўся конкурс у Бярозаўцы ад іншых аналагічных, але некаторыя факты выклікаюць пытаньні.

Напрыклад, ці праводзіліся адборачныя туры (у школах, ліцэі, на заводзе?), хто і па якіх крытэрыях абіраў фіналістак? Ці, можа, ўдзельніц фіналу прызначыў БРСМ, які з’яўляецца арганізатарам конкурсу? То няхай бы тады і назвалі конкурс “Міс БРСМ Бярозаўкі”.

Яшчэ адной цікавосткай сталася тое, што ў фінале было 10 намінацыяў на 10 канкурсантак. Напэўна, арганізатары вырашылі не крыўдзіць нікога з дзяўчат (а то, крый Божа, з БРСМу выйдуць!). Трэба, каб і на сусьветных конкурсах увялі такую практыку: колькі канкурсантак – столькі намінацый! Усе будуць задаволеныя!

Дзеля такой значнай падзеі Бярозаўку наведаў Міхаіл Арда – дэпутат палаты ад Лідскай раённай выбарчай акругі. Зразумела, што шаноўнага госьця абралі старшынём журы ( што, вядома ж, невыпадкова: за шмат гадоў “працы” ў БРСМе спадар Міхаіл, напэўна, навучыўся разьбірацца ў прыгожых дзяўчатах). Нашыя дэпутаты наогул любяць наведваць розныя прыемныя мерапрыемствы ды засядаць у журы ды камісіях, а вось пра тое, што іхнім выбарцам не выплочваюць своечасова заробкі ці пагаршаюць умовы працы, ці пра тое, што пагаршаецца медычнае абслугоўваньне – яны ня ведаюць, ці ня хочуць ведаць.

*Гэты артыкул ня мае на мэце пакрыўдзіць дзяўчат, ахвотна верыцца, што яны шчыра стараліся быць найлепшымі і найпрыгажэйшымі. Хочаца толькі, каб у наступныя разы конкурс адбываўся больш, адкрыта, больш празрыста, а гэта прэтэнзія да арганізатараў.*

***Дж.Ведрыч***

# Адна вада – розныя кошты

Індывідуальнымі лічыльнікамі спажываньня вады абсталявана 98% кватэр у Беларусі. Пра гэта, паводле БелаПАН, на прэс-канфэрэнцыі 25 верасьня паведаміў начальнік упраўленьня камунальнай гаспадаркі Міністэрства жыльлёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі Анатоль Шагун..

Па яго словах, лічыльнікамі абсталявана 2 млн. 495 тыс. 991 кватэра. На пачатак году гэты паказчык складаў 95%.

Урад ставіў задачу ўсталяваць ва ўсіх кватэрах індывідуальныя лічыльнікі вады да 1 студзеня 2009 года. З 1 траўня 2009 года жыхары кватэр, якія ня маюць лічыльнікаў, плацяць за ваду па сабекошце, без дзяржаўнай датацыі.

Гэта будзем лічыць фактам. А зараз разгледзім пытаньне.

Тыя, хто не мае індывідуальных лічыльнікаў, аплочваюць ваду ***ў адпаведнасьці з нарматывамі, зацьверджанымі мясцовымі выканаўчымі ўладамі. У сярэднім нарматыў складае каля 4 куб. м вады ў месяц на чалавека*** (выдзелена нездарма!). Пытаньне ўзнікае наконт выдзеленай часткі тэксту, калі разгледзець сітуацыю з інтэрнатамі, што знаходзяцца ў Бярозаўцы па вул. Школьнай.

Пасьля таго, як гэтая інфармацыя з’явілася ў інтэрнэце, захацелася даведацца, колькі ж плоцяць за ваду мае знаёмыя, якія жывуць ў адным з гэтых інтэрнатаў. Лічба мяне ўразіла: нарматыў, зацьверджаны вядома кім (глядзі вышэй), складае 250 літраў у дзень на чалавека! А за месяц атрымліваецца 7,5 – 7,75 м3 на чалавека!!! І ў выніку сям’я з 4-х чалавек плоціць толькі за ваду больш за 50 тысяч рублёў кожны месяц!



Па праўдзе, для мяне гэта быў мала што не шок. Бо не па чутках ведаю, што ў прыватных кватэрах, дзе ёсьць лічыльнікі, нават не эканомячы людзі плоцяць за ваду сама болей каля 20 тысяч. Пытаюся ў знаёмых, а ці прасілі, каб усталявалі лічыльнікі? Кажуць, так, але ж у ЖКГ сказалі, што гэта немагчыма.

І вось мы наўпрост падышлі да пытаньня: чаму ўсталяваньне лічыльнікаў у інтэрнатах немагчымае? Што, там сістэма водазабеспячэньня чымсьці розьніцца ад той, што ў іншых шматпавярховіках? Ды, здаецца, не. А, можа, іх не хочуць ставіць адмыслова, па карысных прычынах? Бо ўжо вядомыя выпадкі, калі служачыя ЖКГ (не, не Бярозаўскія), спісвалі на людзей, што ня мелі лічыльнікаў, свае кубаметры, ды й сваіх сваякоў. Таксама пытаньне, на падставе якіх дадзеных мясцовая выканаўчая ўлада зацьвердзіла такі нарматыў? Не, мы нават ня будзем падазраваць, што яны з гэтага нешта маюць. Хаця, ўсялякае можа быць. У нашай “прававой” дзяржаве і не такое здараецца.

Хацелася б даведацца, чаму жыхары інтэрнатаў плоцяць за ваду ўдвая болей, чым іншыя грамадзяне Беларусі. Але гэта праблема тых, хто плоціць, і ад іх залежыць, ці здолеюць яны дамагчыся зьменаў.

P.S. Дарэчы, ў Гарадзенскім абласным упраўленьні ЖКГ паведамілі, што норма спажываньня вады ў кватэрах без лічыльнікаў налічваецца з разліку 120 літраў на чалавека ў дзень, і такая норма павінна быць па ўсёй краіне. Ці да Бярозаўкі не даходзяць пастановы вышэйшага кіраўніцтва?

P.P.S.Перад самай здачай нумару ў друк стала вядома, што жыхары інтэрнатаў зьвярнуліся ўсё-ткі да органаў улады з пытаньнем водазабесьпячэньня і нормаў спажываньня вады.

Паглядзім, якія будуць вынікі, а яны будуць: бо толькі бяздзеяньне не мае вынікаў. Як напісана: грукайцеся, і Вам адчыняць!

***Жана Немянтоўская***

У КРАІНЕ

## У Беларусі назіраецца рост жаночага алкагалізму



Пра гэта заявіў загадчык аддзела наркалогіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя Міністэрства аховы здароўя Андрэй Капытаў на прэс-канфэрэнцыі ў Менску.

Паводле яго словаў, калі ў пачатку 1980-х гадоў на адну хворую на алкагалізм жанчыну прыпадала прыкладна 12 мужчын-алкаголікаў, то ў 2000 годзе — 5, у 2008 годзе — 4,5. Чакаецца, што ў будучыні ад алкагалізму жанчыны будуць пакутаваць нароўні з мужчынамі: у падлеткаў 14—15 гадоў хвароба сустракаецца аднолькава часта ў хлопчыкаў і дзяўчынак.

На 1 студзеня 2009 года ў Беларусі на наркалагічным уліку ў сувязі з алкагалізмам знаходзіліся 33.965 жанчын, яшчэ прыблізна 12 тыс. — на прафілактычным уліку.

Як мяркуе спецыяліст, рост колькасьці жанчын, якія п’юць, шмат у чым тлумачыцца тым, што жанчыны сёньня выконваюць тыя ж функцыі, што і мужчыны, і часта адчуваюць двайную нагрузку — на працы і дома. Адзін з найбольш даступных спосабаў зьняць напружаньне — прыём алкаголю.

У сярэднім алкагольная залежнасць фарміруецца ў жанчын да 26-27 гадоў, у мужчын — да 21-22 гадоў. Аднак жаночы алкагалізм хутчэй прагрэсуе: калі ў мужчын хвароба праходзіць усе стадыі на працягу прыкладна 16 гадоў, то ў жанчын — за сем гадоў.

У жанчын, якія пакутуюць ад алкагалізму, прыкладна ў два разы хутчэй адбываецца парушэньне разумовых здольнасьцей, чым у мужчын. Гэта зьвязана з асаблівасьцямі жаночага арганізму, у якім менш вады і, адпаведна, удзельная вага алкаголю большая. Апрача таго, у жаночым арганізме не хапае ферменту, які расшчапляе алкаголь. 82% жанчын, хворых на алкагалізм, маюць запойныя формы алкагалізму. Пры гэтым запоі карацейшыя па часе, чым у мужчын, але здараюцца часьцей.

Паводле словаў спецыяліста, жанчыны ў параўнаньні з мужчынамі часьцей утойваюць свой алкагалізм, многія п’юць у адзіночку, баючыся грамадскага асуджэньня. Да нарколага многія трапляюць на стадыі, калі ўжо пачалася дэградацыя асобы. Гэта садзейнічае падтрыманьню міфу аб тым, што жаночы алкагалізм дрэнна лечыцца.

***Паводле БелаПАН***

## Кватэрнае пытаньне

З 17 лютага 2010 года запісваць у чаргу на жыльлё пачнуць па новых правілах. Чыноўнікі спадзяюцца, што новы ўказ Лукашэнкі №543 ад 16 лістапада 2009 г. скароціць колькасьць тых, хто можа пабудаваць кватэру з дапамогай дзяржпадтрымкі. Толькі ў пачатку года па ўсёй краіне чаргавікоў было больш за 700 тысяч, а ў Менску - 250 тысяч чалавек. І,нягледзячы на тое, што кватэр будуецца ўсё больш, чарга не перастае расьці. Зараз запісацца ў чаргу на жыльлё стане нашмат складаней.

Варта адзначыць, што кошты на жыльлё ў Беларусі мала розьняцца ад эўрапейскіх, хаця заробкі меншыя ў некалькі разоў.

## КДБ змагаецца з іншадумцамі

Пра гэта заявіў прадстаўнікам СМІ начальнік УКДБ Берасьцейскай вобласьці палкоўнік Леанід Дзядкоў. Па яго словах, «са шкодным напрамкам думак у шырокім сэнсе слова ў нас змагаюцца ўсё без выключэньня аператыўныя падразьдзяленьні на замацаваных за імі накірунках працы».

Як бачым, спецслужбы нават не хаваюць, што сваімі дзеяньнямі парушаюць Асноўны закон Рэспублікі Беларусь – Канстытуцыю, у артыкуле 33 якой напісана: “Кожнаму гарантуецца свабода поглядаў, перакананняў і іх свабоднае выказванне.”

Атрымліваецца, што законы ў нашай краіне напісаныя не для ўсіх?

***Паводле Інтэрфакс***

ПЕРШАЯ НЕЗАЛЕЖНАЯ ТЭЛЕВІЗЫЯ БЕЛАРУСІ
www.belsat.eu
БЕЛСАТ tv
BELSAT
на спадарожніку SIRIUS
пазыцыя 5*E
палярызацыя H
чыстата 12379,6 МГц
на спадарожніку ASTRA
пазыцыя 19,2*E
палярызыцыя H
частата 10773 МГц

***Рэдактар і выдавец*** *Алік Бяздумны*
***Надрукавана на абсталяваньні рэдактара***
***Наклад*** *299 асобнікаў*
***Распаўсюджваецца бясплатна***
***E-mail:*** *biarozauka.info@gmail.com*